4. Шаблоўская, ... вопыт. Паэтыка. Тыпалогія / І.В. Шаблоўская. – Мінск: Белдзяржуніверсітэт, 1998. – 20 с.

**К.А. Ермаковіч (Мінск, БДПУ)**

# МАСТАЦКІ ТЭКСТ ЯК СУКУПНАСЦЬ ЧЫТАЦКІХ АЦЭНАК

Мастацкая літаратура аказвае значны ўплыў на фарміраванне маральных якасцей асобы. Уздзейнічаючы на пачуцці, уяўленне і волю чалавека, літаратура мае здольнасць выклікаць эмацыянальную ацэнку рэчаіснасці. Пры знаёмстве з мастацкім творам ва ўяўленні чытача паўстаюць пэўныя малюнкі з жыцця, уяўляюцца канкрэтныя вобразы. А з другога боку, дзякуючы мастацтву слова, дзе адлюстраваны самыя разнастайныя і часам непрадказальныя жыццёвыя сітуацыі, чалавек спасцігае таямніцы, адкрывае нешта новае для сябе. У гэтым – узаемасувязь літаратуры і жыцця. Таму важна ведаць, *што* сёння чытаецца, *што* запатрабавана і *чаго* чакаюць ад мастацкіх тэкстаў.

У 2008 г. з мэтай правядзення праблемнага даследавання ўзаемастасункаў чытача з творамі мастацкай літаратуры была складзена анкета з сямі пытанняў. Апытванне праводзілася сярод студэнтаў IV курса факультэта беларускай філалогіі і культуры БДПУ і сярод вучняў 9 і 11' класаў Маркаўскай сярэдняй школы з беларускай мовай навучання (Маладзечанскі раён). Варта засяродзіць увагу на такіх пытаннях анкеты:

1. Ці чытаеце Вы крытычныя артыкулы на прачытаныя творы? Чаму? Пералічыце манаграфіі, рэцэнзіі, артыкулы вядомых Вам крытыкаў.

2. Які твор беларускага пісьменніка прачыталі ў апошні час? Чаму іменна гэты? Вашы ўражанні, магчыма, кароценькая рэцэнзія.

Паспрабуем прааналізаваць адказы на першае пытанне. Так, адзін з рэспандэнтаў піша: *«Калі я сама чытаю ўвесь твор, то я і сама магу яго крытычна прааналізаваць, а чужыя думкі, з якімі я ў большасці не згаджаюся, не чытаю».* Аднак пры далейшых адказах таго ж анкетуемага асаблівых адносін, а тым больш рэцэнзіі на прачытаны твор, не было. Магчыма, гэта тлумачыцца тым, што чалавеку не хацелася разважаць, думаць, для чаго патрэбны быў бы час, настрой, пэўныя высілкі, ці, можа, проста няма тых ведаў, адпаведнага узроўню для аналізу мастацкага тэксту. Многія з тых, хто час ад часу праглядае манаграфіі і рэцэнзіі, робяць гэта толькі з адной мэтай – падрыхтавацца да экзаменаў, залікаў, курсавых праектаў ці да заняткаў.

Але ж не ўсё яшчэ згублена. На факультэце маецца пласт студэнтаў, якія, каб разабрацца з кампазіцыяй, формай, бывае і са зместам пэўнага твора, або параўнаць свае думкі з меркаваннямі вядомых літаратуразнаўцаў, звяртаюцца да крытычных артыкулаў. Так, сярод гэтай часткі анкетуемых самымі «папулярнымі» сталі такія крытыкі, як У. Гніламёдаў, У. Рагуля, У. Калеснік, М. Мішчанчук. Былі названы і наступныя прозвішчы (зрэдку ўказаны назвы артыкулаў): Д. Бугаёў, В. Бечык, А. Мальдзіс, А. Бельскі, Я. Гарадніцкі, П. Васючэнка, Г. Кісліцына, І. Шпакоўскі і некаторыя іншыя.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Scanned by CamScanner

Відаць, што ўзровень ведаў студэнтаў IV курса нераўназначны: адны «нешта недзе» чулі, другія – праглядвалі, трэція – ужо глядзелі, а нехта і ўвогуле не захацеў адказваць (хочацца думаць, што на гэта былі ў рэспандэнтаў падставы, а не абыякавасць). Вядома, падрыхтаванасць студэнтаў факультэта беларускай філалогіі і культуры розная, але калі ў першакурснікаў яшчэ ёсць магчымасць «расці» (у плане літаратуры), то на чацвёртым – гэтых шанцаў усё менш і менш. Для агульнага развіцця, магчыма, тых ведаў і хопіць, аднак калі чалавек збіраецца працаваць у школе альбо далей вучыцца – для яго пажадана было б добра арыентавацца ў літаратурнай прасторы.

Падмурак жа крытычнага мыслення закладваецца яшчэ ў школе (тут відавочная роля настаўніка). Сярод вучняў увага надаецца ў большай ступені артыкулам, якія змешчаны ў падручніку і, згодна з анкетнымі дадзенымі, прачытваюцца з цікавасцю. Можа, каб школьнай праграмай не скарачаліся, а, наадварот, павялічваліся гадзіны на вывучэнне творчасці таго ці іншага аўтара, у настаўніка было б значна больш магчымасцей праводзіць нетрадыцыйныя, пошукавыя ўрокі. І роля настаўніка-беларусаведа тут заключаецца ў тым, каб зацікавіць навучэнцаў самапазнаннем пры дапамозе параўнальнага аналізу ўласных думак і поглядаў літаратуразнаўцаў, крытыкаў.

Што датычыцца пытання «*Які твор беларускага пісьменніка прачыталі ў апошні час? Чаму іменна гэты? Вашы ўражанні, магчыма кароценькая рэцэнзія*», то тут выклікалі цікавасць такія адказы:

– «*Колькі дзён таму прачытала «Агульны сшытак» Г. Ліхтаровіча. Непараўнальная пейзажная лірыка!!! Таксама спадабаліся хоку, напісаныя на беларускай мове. Вельмі здзіўлена (прыемна) і ўражана творчасцю гэтага аўтара*»;

– «*Ю. Станкевіч. «Любіць ноч – права павукоў». Многа чула пра яго. Казалі, што – рэч! Сапраўды! Тут якраз быў той выпадак, калі стукнула, і стукнула моцна, і па чэрапу. Зараз напампавала з сеціва больш яго твораў*»;

– «*Паэзію Рыгора Барадуліна. Вельмі добра піша. Мне падабаецца. Ёсць рух*»;

– «*Казкі Адама Глобуса. Было цікава з імі пазнаёміцца. Спадабалася тое, што ў вобразах, сімвалах я ўбачыла адпаведнасць з сучаснасцю*».

Так, першы з прыведзеных прыкладаў паказвае, што чалавек ведае не толькі тэрмін, але і самі хоку, прычым беларускіх аўтараў. Гэта гаворыць і пра тое, што анкетуемы «выходзіць» за межы праграмы пэўнага курса і можа хоць нешта адзначыць з прачытанага, зыходзячы не толькі з выкліканых пачуццяў, чаго не скажаш пра наступны адказ, дзе месца ёсць толькі эмацыянальнаму ўспрыняццю твора, а не аналізу. Спачатку і трэці з дадзеных адказаў не выклікае асаблівай зацікаўленасці. *Вельмі добра піша. Мне падабаецца* – безумоўна, эмацыянальная ацэнка. Аднак звернем увагу на апошні сказ: «*Ёсць рух*». На жаль, рэспандэнт не тлумачыць яго: у чым гэты рух заключаецца? Дарэчы, гэтаксама паўстае пытанне і ў апошнім выказванні: як разумець адпаведнасць з сучаснасцю?

Але, на жаль, асноўны пласт складаюць тыя рэспандэнты, якія чытаюць выключна праграмныя творы, неабходныя для напісання курсавой або падрыхтоўкі да практычных заняткаў. Асноўная прычына такога выбару тэкстаў – недахоп часу («*паспець хоць бы гэта!!!*»). Ці проста прапала ахвота чытаць нешта: «*Ты не паверыш – Куляшова! А да гэтага – Танка (усё як у аптэцы – па праграме)*».

Сярод адзінаццацікласнікаў самай масавай (у адносінах да колькасці прачытаных апошнім часам) стала п'еса Янкі Купалы «Раскіданае гняздо», бо «*гэты твор патрэбны да*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ



Scanned by CamScanner

*ўрока беларускай літаратуры; дарэчы, тэкст вельмі спадабаўся»*. Не засталіся па-за ўвагай і «Людзі на балоце» І. Мележа, і «Гандлярка і паэт» І. Шамякіна. А вучні IX класа адзначылі камедыю К. Крапівы «Хто смяецца апошнім». Зноў – праграма.

Сённяшні стан беларускай літаратуры мае вялікі дыяпазон мастацкіх тэкстаў як традыцыйнай, так і авангардысцкай скіраванасці. І ў сувязі з гэтым адзін і той жа тэкст чытачы рознай адукацыі, рознага ўзросту ацэньваюць па-свойму. Мастацкі твор толькі выйграе, калі яго бачыць у люстэрку прачытання розных рэспандэнтаў. Напрыканцы 1980-х гг. была выдадзена кніга «Сучасная літаратура і чытач», у якой супрацоўнікі Інстытута літаратуры імя Якуба Коласа адлюстравалі асаблівасці тагачасных чытацкіх інтарэсаў пэўных груп людзей (як па ўзроставых паказчыках, так і па адукацыйных, прафесійных). Але, на жаль, дадзеная праца была перапынена, і нейкі час да гэтай праблемы ніхто не звяртаўся. Думаецца, наспеў той момант, калі варта было б вярнуцца да распачатага і правесці грунтоўны аналіз сучаснай літаратуры вачыма чытача, паколькі мастацкі тэкст у многім – гэта сукупнасць чытацкіх ацэнак.

***Літаратура***


1. Бельскі, А. Сучасная літаратура Беларусі / А. Бельскі. – Мінск: Аверсэв, 2000. – 127 с.
2. Васючэнка, П. Ад тэксту да філагемы / П. Васючэнка // Дзеяслоў. – 2008. – № 5. – С. 289–299.
3. Козіч, В.І. Адукацыя, род заняткаў, месцажыхарства чытача і літаратура / В.І. Козіч // Сучасная літаратура і чытач / Л.М. Гарэлік і інш.; рэд. П.К. Дзюбайла. – Мінск, 1998. – С. 222–286.
4. Лысенка, А.Ф. Пісьменнік і чытач / А.Ф. Лысенка // Сучасная літаратура і чытач / Л.М. Гарэлік і інш.; рэд. П.К. Дзюбайла. – Мінск, 1988. – С. 94 – 162.



***С.У. Калядка (Мінск, ІМіЛ НАНБ)***


## НЕКАТОРЫЯ СТАРОНКІ «ЛІСТКОЎ КАЛЕНДАРА» МАКСІМА ТАНКА: ПРАЗ ПРЫЗМУ АРХІЎНЫХ ДАКУМЕНТАЎ

«Лісткі календара» ахопліваюць пяць гадоў з 1935 па 1939 г. А гэта вельмі важныя гады ў фарміраванні асобы Яўгена Іванавіча Скурко і творчай індывідуальнасці Максіма Танка. Максім Танк – адзін з тых самародкаў, які, не маючы вышэйшай адукацыі, набываў яе ўсё жыццё самастойна і ў гэтым дасягнуў значных вынікаў. Адзначым, што Яўген Скурко вучыўся ў чатырох гімназіях (Рускай гімназіі ў Вілейцы, Радашковіцкай беларускай гімназіі, Віленскай беларускай гімназіі, Рускай гімназіі імя А.С. Пушкіна ў Вільні), не скончыўшы пры гэтым ні адной: адной з прычын было яго выключэнне з дзвюх гімназій за ўдзел у вучнёўскіх забастоўках. Рэвалюцыйная скіраванасць дзейнасці ў многім кампраментавала яго ў вачах улады і рабіла яго неблаганадзейным, што ў хуткім часе ў 1932 г. прывяло да арышту і знявольвання ў Лукішскай турме. Другі раз Максім Танк трапіў у турму ў 1934 г. У БДАМЛМ, ф. 25, неапрац. матэр. захоўваюцца копіі дакументаў на польскай мове з двух судовых спраў 1933 і 1934 гг., па якіх мы можам узнавіць храналогію допытаў і зняволення Яўгена Скурко ў кастрычніку 1934 г.

У 1961 г. сябра Ёнас Каросас, літоўскі журналіст, рэдактар газеты «Tiesa», дасылае Максіму Танку наступны ліст (захоўваецца ў БДАМЛМ, ф. 25): «По имеющимся у меня выпискам из архивных дел могу сообщить тебе следующее:

Ты был арестован 1933. 5. 27.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Scanned by CamScanner